**УДК 821.161.3** **DOI 10.52928/2070-1608-2025-74-2-29-32**

# АНАЛІТЫЧНЫ РОЗДУМ ПРА ПЕРШУЮ СУСВЕТНУЮ ВАЙНУ Ў МАЛОЙ ПРОЗЕ РЫГОРА МУРАШКІ

***д-р філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
**(*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай*)**
***e-mail:*** *zoya.tretyak@rambler.ru*

*У артыкуле разглядаюцца творы «У іхным доме», «Вінчэсцер», «Закапаны пуп», «На катарзе акопнай» Р. Мурашкі (1902–1944), абраныя паводле адной з тэматычных прыкмет: інклюзіўнага увасаблення Першай сусветнай вайны. Падзеі 1914 – 18 гг. уводзяцца ў сюжэтную канву дзякуючы апавядальніку, які лаканічна акрэслівае сітуацыю, падагульняе вопыт дзейных асоб ці ўводзіць іх простую мову. Апавядальнік не столькі імкнецца да заглыблення ў шматлікія акалічнасці будзённасці, колькі прапануе аналітычны роздум пра перажытае, у якім пераважаюць высновы, зробленыя паводле рэфлексіі персанажаў з нагоды асноўных экзістэнцыйных пытанняў, выкліканых татальнай вайной. Паралельна аўтар звяртаецца да авантурнага і табуіраванага, што падкрэслівае шматграннасць разглядаемага феномену.*

**Ключавыя словы:** *Першая сусветная вайна, беларуская літаратура, Рыгор Мурашка, малая проза, апавядальнік, лапідарнасць.*

**Уводзіны.** Інклюзіўнае ўвасабленне падзей Першай сусветнай вайны ў прозе Р. Мурашкі («Вінчэсцер», «У іхным доме», «На катарзе акопнай», «Закапаны пуп») мае шэраг адметнасцей, адной з якіх з’яўляецца аповед ад трэцяй асобы. Паводле аўтарскай задумы, чытач знаёміцца з аналітычным роздумам апавядальніка, які асэнсоўвае звесткі пра ўзброены канфлікт 1914–1918 гг., уведзены ў кантэкст не менш адметных рэалій пачатку XX ст. Гэта робіцца з адносна вялікай часавай адлегласці, што тлумачыць высокую ступень абагульнення і абстрагавання ад мікрадэталяў. У кантэксце аналітызму твораў Р. Мурашкі варта згадаць назіранні М. Мушынскага, які звярнуў увагу на характэрную для спадчыны пісьменніка рысу: «барацьбу дзвюх у прынцыпе несумяшчальных тэндэнцый – аналітычнай, аб’ектыўна-мастацкай і спрошчана-класавай, аголена-публіцыстычнай» [1, с. 718].

Пісьменніцкая канцэпцыя адлюстравання Першай сусветнай, відавочна, звязана з асабістым досведам Р. Мурашкі як сучасніка вайны 1914 – 18 гг., удзельніка барацьбы з белапалякамі на Случчыне (1919–1920), вайскоўца у Чырвонай Арміі (1920–1921, 1924–1926) [2, с. 341]. Адзначым, што персанальны вопыт будучага празаіка быў дастаткова тыповым для яго пакалення. Пра гэта сведчыў Анатоль Ажгірэй (Алёша) у гумарэсцы «Рыгор Мурашка» (з адпаведнай гэтаму жанру танальнасцю): «Кончыў, кажа, Рыгор, я франты, белапалякаў, кажа, разьбіў, – Врангель, кажа, уцёк, – Калчак, кажа, сам застрэліўся» [3, с. 16]. Тым не менш, напрацягу літаральна дзесяцігоддзя Р. Мурашка паспеў адчуць фатальную дынаміку гістарычных змен, заўважыць, як змяняюцца надзённыя ўяўленні пра баявыя дзеянні і легітымныя сродкі іх вядзення, усвядоміць, што вайна / навала-кантынуум справакавала далейшае абвастрэнне ўсеахопнага аксіялагічнага крызісу пачатку XX ст. У такіх варунках пытанне мастацкага адлюстравання набытага вопыту было надзвычай актуальным.

Мэта даследавання – вызначыць спецыфіку мастацкага ўвасаблення Першай сусветнай вайны ў малой прозе Р. Мурашкі.

**Асноўная частка.** Увасобленае Р. Мурашкам прэзентуе шырокі спектр з’яў, звязаных з ваеннай рэчаіснасцю, аднак пісьменнік і апавядальнік, як блізкі аўтару суб’ект маўлення і «носьбіт найбольш нейтральнай моўнай стыхіі» [4, с. 167], пакідаюць за сабой права вылучыць з бясконцага шэрагу падзей і працэсаў толькі канцэптуальна важкае. Расказанае досыць лаканічна, яно дазваляе выйсці на ўзровень анталагічных абагульненняў, якія робяць відавочнымі пэўныя залежнасці чалавечага існавання на татальнай вайне. Падобны падыход да мастацкага асэнсавання ўзброенай барацьбы ў плыні іншых гістарычных падзей пацвярджае назіранні аднаго з першых рэцэнзентаў твораў Р. Мурашкі – М. Аляхновіча, які звярнуў увагу на «багатую наглядальнасць» і спробы аўтара «падысьці да спрадвечных пытанняў чалавечага жыцця» [5, с. 38]. Варта ўвагі і тое, што апавядальнік не манапалізуе права выказвання, таму ў тэкст уводзіцца простая мова іншых персанажаў, якія лапідарна сведчаць пра ўласны вопыт. У абодвух выпадках у падтэкст вынесены больш-менш знаёмыя чытачу акалічнасці франтавога, тылавога і бежанскага быцця, якія магчыма ўзнавіць дзякуючы ведам па гісторыі вайны, знаёмству з іншымі літаратурна-мастацкімі творамі на тую ж тэматыку, логіцы развіцця сюжэта. Паводле формы, занатаваныя эпізоды гіпатэтычна з лёгкасцю маглі разгарнуцца да памераў самастойнага твора. Падобная гранічная лаканічнасць увасаблення падзей, звязаных з Першай сусветнай вайной, абумоўлена, у тым ліку, яе інклюзіўным разглядам у творы, дзе ўвага апавядальніка скіроўвалася на адмысловы комплекс грамадска-палітычных і псіхалагічных праблем, якія вызначалі быццё чалавека ў 1910-я гг. Вылучаныя паводле тэматычных прыкмет, «ваенныя» ўрыўкі з твораў Р. Мурашкі ўскладнялі аповедавую канву, пацвярджаючы, што проза аўтара «задумана і напісана заўсёды цікава», а «стыль вобразны і дынамічны» [6, с. 101].

Адзначым, што ў апавяданні «На катарзе акопнай» Р. Мурашка прапануе чытачу прааналізаваць радыкальна адрозны вопыт некалькіх шараговых салдатаў. Шукаючы адэкватныя сродкі моўнага ўвасаблення перажытага,

безыменныя персанажы, паводле аўтарскай задумы, імкнуліся ўвасобіць канцэптуальна значныя трансфармацыі ўласнага светапогляду, выкліканыя надзвычайнымі абставінамі часоў вайны. Адзін з іх прыгадаў сваю рэакцыю на ўзнагароду: «Я не ішоў на вайну георгія заслужваць. Мяне ўзялі з аднае катаргі, з фабрычнае, ды перагналі на другую, акопную. З адных ланцугоў закулі ў другія. А георгій … Георгій … Ён мне толькі ўспамінак, што я павінен быў выратаваць ад смерці жыццё сваіх таварышаў па гэтым ненавісным мне шынялю» [7, с. 65]. Персанаж падкрэслена адмоўна ставіўся не столькі да афіцыйнай узнагароды, колькі да ўсяго комплексу грамадска-палітычных чыннікаў, якія прывялі яго на поле бою і змусілі здзейсніць геройскі ўчынак, прынцыпова не згаданы ў тэксце апавядання. З цытаты вынікае, што георгіеўскі кавалер не імкнуўся да самаўхвалы і канстатавання ўласнай выключнасці на фоне таварышаў па службе, гэтак жа падуладных волі лёсавызначальнага выпадку.

Яшчэ адзін экс-камбатант бессаромна прызнаваўся: «Я дык ніякіх жахаў не ведаю, каго хоч буду страляць. Вось толькі старых ды дзяцей … так, гэтых не страляў яшчэ. Але-ж і таму нядоўга прызвычаіцца. Важна пачаць толькі» [7, с. 65]. У падтэкст вынесены жыццёвыя акалічнасці, якія прымусілі персанажа прыйсці да падобных цынічных разваг. Ступень шчырасці гэтага вайскоўца для чытача застаецца няяснай: у сітуацыі, калі простая мова персанажа падаецца як адзіная крыніца інфармацыі пра яго, складана змадэляваць цэласны вобраз, лад мыслення і каштоўнасныя арыентацыі такога персанажа. Тым не менш, яго словы гучаць правакацыйна, выклікаючы ў чытача, выхаванага ў гуманістычнай парадыгме, пачуццё кагнітыўнага дысанансу.

Іншы герой апавядання «На катарзе акопнай» прэзентаваў свой ваенны вопыт так: «я так стаміўся, як я стаміўся <…> Спачатку, як мабілізавалі мяне, дык было маркотна <…> а потым зацягнула праклятая … Нянавісць нейкая зайшла ў сэрца. І страляў, і калоў, і прыкладам біў. Але вось і прапала ўжо яна, знікла, і цяпер на сэрцы пуста і адзінока. І нікога не жадаю ўбачыць, і нічога не чакаю больш, нішто не люба, і нічога не магу ненавідзець. Каб смерць прышла, здаецца, каб заснуць і нічога не ведаць гэтага» [7, с. 65–66]. Акрэсленая ў цытаце рэакцыя на траўматычны досвед сусветнай вайны адмыслова карэлюе з падобныміназіраннямі ў творах прадстаўнікоў «страчанага пакалення» (Р. Олдынгтана, Э.М. Рэмарка). Відавочна, што прапанаваныя Р. Мурашкам тры мікра-гісторыі закраналі надзвычай табуіраваныя тэмы, якія разбуралі стэрэатыпныя ўяўленні пра ваенны досвед і мастацкі патэнцыял ваеннай прозы як жанра айчыннай літаратуры, запатрабаванага ў 1920 – 30-я гг.

Найбольш падрабязна ў названым апавяданні акрэслены досвед селяніна, гвалтоўна прызванага на вайну. У адрозненне ад папярэдніх фрагментаў, пададзеных ад першай асобы, акцэнты зменены: чытач бачыць сітуацыю вачыма апавядальніка, які падсумоўвае перажытае персанажам. Аповед будуецца на проціпастаўленні даваеннага досведу і франтавога вопыту, прычым даваеннае акрэслена схематычна: «ён быў хлебаробам: араў, сеяў, касіў, малаціў <…> І раптам дзіка вырвалі яго з прывычнага жыцця, выдалі лубкую бялізну, адзелі ў зялёную гімнасцёрку і шаравары, брудныя патрэсканыя ногі абулі ў цяжкія боты, а зверху ўсё гэта накрылі шынялём» [7, с. 67]. Шмат увагі надаецца першым ураженням персанажа, далёкага ад вайны і вайсковай справы, ад салдацкага побыту (эпізод з абмундзіраваннем). Апавядальнік падкрэсліў, наколькі недарэчна селянін адчуваў сябе на фронце, асабліва калі прыгадваў дом і марыў «пахадзіць да зморы за плугам ці бараною і адчуць свежы халадок разварушанай зямлі пад босымі нагамі. Але як ветрам павеяўшы прагнала лятуценні, і рука сціснула моцна вінтоўку» [7, с. 67].

Айчыннае літаратуразнаўства 1930-х гг. разглядала мікрасюжэты з апавядання «На катарзе акопнай» у сувязі з «раскрыццём дачыненьняў біалёгічнага і сацыяльнага ў розных клясах і клясавых групоўках» [8, с. 141]. Карыстаючыся класіфікацыяй персанажаў у творах Р. Мурашкі, прапанаванай М. Піятуховічам, вобразы георгіеўскага кавалера і селяніна варта разглядаць як тыпы персанажаў, у жыцці якіх сацыяльнае перамагае біялагічнае, затое «крыважэрны» вайсковец ілюструе той тып дзейных асоб, чыё жыццё характарызуецца «панаваньнем зьвярыных біялёгічных інстынктаў» [8, с. 141].

У апавяданні «На катарзе акопнай» прысутнічае яшчэ адзін «персанаж»: жывая і нежывая прырода адухаўляецца, каб увасобіць адмысловы стан людзей, якія на сабе адчулі гвалт сусветнай вайны. Апавядальнік звяртаецца да архетыповых вобразаў, угрунтаваных у айчынным фальклоры: «зраненае, акрываўленае сонца тужліва злягло на ўзгорак, і здавалася: назаўсёды сягоння пакідае яно гэты тленны, няўтульны свет. Галасны звонкі хор птушак не праспяваў яму свайго вечаровага гімна, як заўсёды. Напалоханыя жудаснай смерцю, яны далёка за сабою пакінулі свой разбураны зялёны палац. Зацыркаў адзінокі цвыркун і, нібыта спалохаўшыся свае смеласці ці мо, адзіноты, адразу ўціх. Быццам дух жыцця назаўсёды пакінуў гэтыя неабсяжныя, квяцістыя некалі, прасторы» [7, с. 65]. Некалі велічны вечаровы пейзаж, апаганены ўзброенай барацьбой і пазбаўлены звыклых гукаў і фарбаў, выглядаў недарэчна, падкрэсліваў унутраную разгубленасць персанажаў, якія сутыкнуліся з той экстрэмальнай сітуацыяй, што паралізоўвала волю асобы, знішчала веру ў гуманнае светаўпарадкаванне і рацыянальнасць чалавечага грамадства.

У апавяданні «Закопаны пуп», звяртаючыся да падзей сусветнай вайны, Р. Мурашка імкнецца не столькі да скрупулёзнага аналізу прыватных эпізодаў, колькі да стварэння абагуленага малюнка, у якім увасобілася сама атмасфера эпохі: «нямецкая вайна ў плач і нэндзу ўкінула сяло, павуціньнем смутку апляла твары бацькоў, дзяцей. Ішлі на вайну з плачам, ішлі з песьнямі, але праводзілі іх заўсёды сьлёзы тых, хто заставаліся. Шмат хто і не паварочаліся і іх вясёласьць ці туга перад адыходам пазабываліся, шмат папрыходзілі калекамі – старцамі; шмат якія не далічыліся ў сваіх сем'ях блізкіх – дарагіх; шмат хто знайшлі новых, сваіх – чужых. Такі закон вайны» [9, с. 3]. Паказальна, што апавядальніка цікавіць не столькі спецыфіка баявых дзеянняў і ўдасканаленне сродкаў масавага вынішчэння, колькі рэакцыя чалавека на катастрофу, якая радыкальна змяніла яго жыццё і лад мыслення, вымусіла перагледзець адносіны да сябе і іншых.

У апавяданні «Вінчэсцер» Р. Мурашка часткова падагульняе вопыт пакалення «дзяцей» Першай сусветнай: «Якуш на трынаццатым годзе гаспадаром зрабіўся. Выпала яму гэта звычайна, як і поўна каму тады. Праз год як пачалася нямецкая вайна бацьку Якушовага забралі на вайну. Ну, і стаў Якуш гаспадарыць, бо маці ўсё больш плакала, чымсь работу рабіла» [10, с. 70]. Тыповая гісторыя дачаснага сталення не патрабуе залішняй дэталізацыі і меладраматычных калізій, таму, не жадаючы спрасціць і баналізаваць перажытае, апавядальнік толькі акрэслівае кола праблем, з якімі сутыкнуліся падобныя Якушу персанажы і іх прататыпы з рэальнага жыцця.

У сувязі з сюжэтнай лініяй персанажа-падлетка ў твор уводзіцца прыгодніцкі элемент. Найбольш яскрава ён прэзентаваны ў эпізодзе, калі моладзь кідала ў вогнішча кулі: «нешта раз пасьля вельмі патаемнае сяброўскае нарады са сваімі калегамі ў падпавеці Якуш старанна агледзеў салдацкія патранташы і патронныя сумкі сваіх кватарантаў і <…> праляцеў на мышастым па вуліцы на пашу. Таго дня ад самага паўдня і да вечару лапацела нешта на палетку, быццам гладкае белае палатно моцна разрывалася на шматкі» [10, с. 71]. Апавядальнік засяродзіўся на ўплыве баявых дзеянняў на свядомасць маладога пакалення, якое практычна не памятала даваеннага мінулага і ўспрымала зброю, рыштунак і вайсковае адзенне як зухаватыя знакі далучанасці да геройска-авантурнага, як сведчанне нейкай новай адукаванасці, якая дазваляла па-мужчынску сцвердзіцца следам за бацькамі.

Паралельна ў творы пададзены кантэкст эпохі, якая падначаліла сабе сталенне Якуша. Апавядальнік не імкнуўся да ўвасаблення вайны як глабальнага феномена: шараговы жыхар беларускай вёскі хутчэй прадчуваў, чым усведамляў, татальны характар гэтай навалы. Таму ў апавяданні прыгаданы знаёмыя і блізкія селяніну рэаліі кшталту будзённасці невялікага паселішча, парушанай з прыездам туды вайскоўцаў: «увечары па вуліцы паплылі сьпевы, ды залівістыя гукі гармонікаў. А праз які тыдзень у жалобнай вёсцы па вечары падаплоцьцю шалясцелі пары, ды пазавугольлю – жаноцкае хіхіканьне ўпярэмежку з салдацкім рогатам» [10, с. 71]. Паводле апавядальніка, будзённае і святочнае зліліся ў адно, несучы новы вопыт, замяшанне і няпэўнасць. Новыя ўражанні несла знаёмства з усім вайсковым: «у вёсцы часта мяняліся салдаты, адны выяжджалі, другія наяжджалі. Кватаравала і пяхота, і коньніца, і пантонныя розныя паркі, і інжынэрныя дружыны, а пад канец прыехала зенітная батарэя» [10, с. 72]. Экстрэмальны характар часу меў на ўвазе не толькі «размыванне» грамады за кошт вялікай колькасці новапрыбылых, але і з’явы, што ўспрымаліся вяскоўцамі як апакаліптычныя: «З-пад Баранавіч ціхім надвячоркам чутна зрабілася гарматная страляніна – немцы ўпарта і мэтадычна раўнялі з зямлёю слаба ўзмоцненыя расійскія акопы <…> Немаль штодня над вёскаю гулі самалёты: ляталі страшныя “Ільі-Мурамцы”. Вёска ўспалошылася, пачала рыхтавацца ў зьбежанцы» [10, с. 72]. Аўтар, які паводле ўласных перакананняў займаў выразна атэістычную пазіцыю, алюзійна адсылаў чытача да біблейскай гісторыі пра вавілонскае змяшэнне народаў і моў. Катастрафізм гэтай архетыповай сітуацыі набыў адмысловыя маштабы, калі «з захаду дзень пры дні загрымела саша: ішла з музыкаю пяхота, грукацела артылерыя, ляскацела коньніца, пляліся адны за адным па бакавіцах зьбежанскія кары» [10, с. 72].

У аповесці «У іхным доме», напісанай у 1929 г., апавядальнік расказвае пра персанажа, які ў тагачаснага чытача павінен быў асацыявацца выключна з заганамі буржуазнай маралі і яе носьбітаў. Нават пачатак сталага жыцця гераіні не выклікаў ні спачування, ні паразумення: «Васемнаццаць <…> Вабна і прыгожа разгарнулася вайна. А яна ўжо не проста Вольгачка, а Вольга Алексееўна – міласэрная сястра тылавога шпіталю ў буйным горадзе <…> Зрок засьцілаецца шумлівымі рэстаранамі, віном, патанае ў афіцэрскіх дужых ласках. Бяссонныя ночы, гульбы, віно і ласкі. Нават зараз круціцца галава ад гэтага тлуму» [11, с. 16]. Акцэнт на авантурным і пачуццёвым дадаваў вобразу Вольгачкі пікантнасці, што межавала з непрыстойнасцю ды разбэшчанасцю. Аднак авантуры гераіні ў віры Першай сусветнай вайны хутка перапыніліся рэвалюцыяй, калі, паводле няўласна-простай мовы дзяўчыны, «усё апранулася ў цемру, страх і немайвернасць» [11, с. 17], а яна сама апынулася на перыферыі жыцця. Гэтыя акалічнасці вызначылі далейшыя перыпетыі сюжэту і трагічны лёс сястры са шпіталю Вольгі Аляксееўны.

**Заключэнне.** У апавяданнях «Вінчэсцер», «Закапаны пуп», «На катарзе акопнай» і аповесці «У іхным доме» падзеі Першай сусветнай вайны інкарпаруюцца ў кантэкст іншых сацыяльных трансфармацый дзякуючы постаці апавядальніка, які ашчадна знітоўвае розныя сюжэтныя лініі і імкнецца лапідарна, але ёміста распавесці пра вузлавыя моманты ў жыцці персанажаў.

У апавяданні «На катарзе акопнай» заўважаецца адмысловы дыялог паміж апавядальнікам і дзейнымі асобамі, якія ў аднолькавай ступені акцэнтуюць увагу на радыкальным уплыве ваеннага вопыту на індывіда. Простая мова персанажаў, што захоўвае індывідуальныя рысы маўлення, камплементарна далучаецца да тлумачэнняў апавядальніка: у абодвух выпадках нарацыя грунтуецца на жаданні выказаць толькі тое, што стала вынікам доўгатэрміновага і скрупулёзнага аналізу, падчас якога не робіцца выключэнняў для табуіраваннага, шакіруючага ці прафаннага. У апавяданні «Закапаны пуп» вайна 1914 – 18 гг. увасоблена інклюзіўна: у кароткім урыўку, прысвечаным таму часу, Р. Мурашка разважае пра перажытае шараговым чалавекам у рэфлексіўным рэчышчы, вылучаючы толькі найбольш важкія пытанні экзістэнцыйнага характару, справакаваныя сусветным руйнаваннем. Апавяданне «Вінчэсцер» вызначаецца, па-першае, распрацоўкай матыву «страчанага дзяцінства», па-другое, празаік адаптуе да часоў сацыялістычнага рэалізму матыў новага «вавілонскага змяшэння» моў і звычаяў. Гэты новы Вавілон выкліканы размываннем патрыярхальнай сялянскай грамады пад уплывам новапрыбылых: салдатаў з розных вайсковых адзінак і бежанцаў. У аповесці «У іхным доме» апавядальнік скіроўвае ўвагу на лёс жанчыны, разбэшчанай і зламанай усёдазволенасцю вайны, паказваючы адмоўнага персанажа, ідэалагічна чужога для чытача-сучасніка Рыгора Мурашкі.

ЛІТАРАТУРА


1. Мушынскі М. Рыгор Мурашка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 т. – Т. 2: 1921 – 1941. – 2-е выд. – Мінск : Белар. навука, 1999. – С. 711 – 746.
2. Чыгрын І. Мурашка Рыгор // Беларускія пісьменнікі: біябібл. сл.: у 6 т. – Мінск: Белар. энцыкл., 1994. – Т.4. – С. 341.
3. Алёша. Рыгор Мурашка. Гумарэска // Чырвоная Беларусь. – 1931. – № 13. – С. 16.
4. Тамарченко Н. Повествователь // Поэтика: словарь актуальных терминов и понятий. – М.: Изд-во Кулагиной; Intrada, 2008. – С. 167–169.
5. Аляхновіч М. Маладняк // Маладняк Барысаўшчыны. – 1926. – № 1. – С. 34–40.
6. Гарэцкі М. «Маладняк» за пяць гадоў. 1923 – 1928 гг. – Менск: Бел. дзярж. выд-ва, 1928. – 122 с.
7. Мурашка Р. На катарзе акопнай // Полымя рэвалюцыі. – 1934. – № 10. – С. 65–71.
8. Піотуховіч М. Асноўныя этапы ў развіцьці беларускай літаратуры пасьлякастрычнікаўскага пэрыяду // Полымя рэвалюцыі. – 1933. – № 1. – С. 130–154.
9. Мурашка Р. Закопаны пуп // Чырвоная Беларусь. – 1930. – № 12. – С. 2–5.
10. Мурашка Р. Вінчэсьцер // Маладняк. – 1928. – № 12. – С. 70–78.
11. Мурашка Р. У іхным доме // Маладняк. – 1928. – № 2. – С. 12–47.


*Паступіў 14.12.2024*

## АНАЛИТИЧЕСКИЕ РАЗМЫШЛЕНИЯ О ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЕ В МАЛОЙ ПРОЗЕ РЫГОРА МУРАШКИ

***д-р филол. наук, доц. З. ТРЕТЬЯК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье рассматриваются произведения «В ихнем доме», «Винчестер», «Закопанная пуповина», «На каторге окопной» Р. Мурашки (1902–1944), выбранные по одному из тематических признаков: инклюзивному воплощению Первой мировой войны. События 1914 – 18 гг. вводятся в сюжетную канву благодаря рассказчику, который кратко описывает ситуацию, обобщает опыт действующих лиц или вводит их прямую речь. Рассказчик не столько стремится вникнуть во многие обстоятельства повседневной жизни, сколько предлагает аналитические размышления над пережитым, в котором преобладают выводы, сделанные на основе размышлений героев об основных экзистенциальных вопросах, вызванных тотальной войной. При этом автор обращается к авантюрному и табуированному, что подчеркивает многогранность рассматриваемого явления.*

***Ключевые слова:*** *Первая мировая война, белорусская литература, Рыгор Мурашка, малая проза, рассказчик, лапидарность.*

## ANALYTICAL THOUGHT ABOUT THE FIRST WORLD WAR IN RYHOR MURASHKA'S SHORT STORIES

***Z. TRATSIAK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article examines the works 'At Their Home', 'Winchester', 'Buried Umbilical Cord', 'In the Trenches' by R. Murashka (1902–1944). They are selected according to one of the thematic features: the inclusive embodiment of the First World War. The events of 1914 – 18 are introduced into the plot by the narrator, who laconically describes the situation, summarises the characters' experience or introduces their direct speech. The narrator does not strive to delve into the numerous circumstances of everyday life but offers an analytical reflection on the experience. The conclusions drawn from the characters' reflection on the main existential questions caused by the total war prevail. At the same time, the author turns to the adventurous and the taboo emphasizing the multifaceted nature of the phenomenon under consideration.*

***Keywords:*** *World War I, Belarusian literature, Ryhor Murashka, short story, storyteller, conciseness.*